# Слоўнік
## выдавецкіх і паліграфічных тэрмінаў

ангельска-беларускі
беларуска-ангельскі



# СЛОЎНІК

***выдавецкіх***
***і паліграфічных***
***тэрмінаў***

# A DICTIONARY
## *of Publishing and Printing Terminology*

**English-Belarusian**
**Belarusian-English**

Minsk
"Technalohija"
2003

# СЛОЎНІК
## *выдавецкіх і паліграфічных тэрмінаў*

**ангельска-беларускі**
**беларуска-ангельскі**

Мінск
"Тэхналогія"
2003

УДК 655(038)=111=161.3+655(038)=161.3=111
ББК 37.8я2
С 48

Правы на ангельскі тэкст належаць P.H. Collin © 1996.
English language text P.H. Collin © 1996.

Укладальнік
*Кастусь Санько*
Навуковы рэдактар
*Алесь Зьмітровіч*

**Слоўнік** выдавецкіх і паліграфічных тэрмінаў: анг.-бел., бел.-анг. / Уклад.
С 48 К.Санько; Навук. рэд. А.Зьмітровіч. — Мн.: Тэхналогія, 2003. — 93 с.

ISBN 985-458-066-0.

Такі слоўнік выдаецца ў Беларусі ўпершыню. Тут сабраная сучасная тэрміналогія з галіны кнігавыдання, друкарскай справы, а таксама кнігараспаўсюджання. Слоўнік зьмяшчае па дзве з паловай тысячы тэрмінаў у кожнай моўнай версіі.

Для выдаўцоў, паліграфістаў, кнігазнаўцаў, мовазнаўцаў-тэрмінолагаў. Будзе карысны таксама студэнтам і аспірантам адпаведных спецыяльнасцяў.

**УДК 655(038)=111=161.3+655(038)=161.3=111**
**ББК 37.8я2**

ISBN 985-458-066-0

© «Тэхналогія», 2003

# АД ВЫДАВЕЦТВА

Наша краіна мае даўнія традыцыі кнігавыдання. Немагчыма ўявіць сабе адукаванага беларуса, які не ведаў бы імя Францішка Скарыны, нашага першага кнігавыдаўца. Мы можам ганарыцца, што ўваходзім у лік чатырох эўрапейскіх народаў, якія першымі атрымалі друкаваную Біблію на сваёй роднай мове. Дый набыткі беларускага кнігавыдання найноўшага часу шмат чым уражваюць і выклікаюць павагу.

Але, як гэта ні дзіўна, дагэтуль мы не мелі слоўніка, дзе хоць збольшага была б сабраная і спарадкаваная прафесійная лексіка з гэтай галіны, — аўтарытэтны даведнік "Беларускія слоўнікі і энцыклапедыі"* засведчыў іх адсутнасць. Праўда, на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя была спроба стварыць расейска-беларускі слоўнік выдавецкіх тэрмінаў, але завяршыць тую працу не ўдалося.

Ад таго часу адбыліся вялікія змены. Дастасаванне кампутарнай тэхнікі зрабіла сапраўдную рэвалюцыю ў выдавецкай справе, цалкам перамясціўшы працэс падрыхтоўкі кнігі да друку (у тым ліку набор, праўку, шыхтаванне, колерападзел) у выдавецтва. Разам з тым яно далучыла да гэтай справы шырокія колы маладых людзей, шчыра перакананых, што веданне кампутара і "пяцёрка" ў школьным атэстаце па мове аўтаматычна робяць іх выдаўцамі. Гэтыя абставіны выклікаюць патрэбу ў даведніку, які змяшчаў бы не толькі корпус тэрмінаў, эквівалентных іншамоўным, але і тлумачэнні да іх, а пры неабходнасці і кароткія азначэнні.

З кожным годам усё больш пашыраюцца бізнэсовыя кантакты беларусаў з замежнымі партнёрамі. Гэта датычыць і кнігавыдавецкай справы (набыццё аўтарскіх правоў, размяшчэнне замоваў на паліграфічныя паслугі, ажыццяўленне супольных выдавецкіх праектаў, купля і абслугоўванне тэхнікі і абсталявання). Таму суаднесенасць беларускай тэрміналогіі з ангельскай зусім натуральная. Бо ангельская мова ўжо даволі даўно і трывала пераняла колішнюю ролю лаціны, стаўшы моваю міжнароднага супрацоўніцтва.

Слоўнік мае дзве часткі — ангельска-беларускую і беларуска-ангельскую. Кожная з іх змяшчае блізу 2500 тэрміналагічных адзінак. Ангельска-беларуская частка складзеная на базе словаспісу, падрыхтаванага брытанскім выдаўцом Пітэрам Колінам. Ангельскія словы і словазлу-

---

* Беларускія слоўнікі й энцыкляпэдыі: Бібліяграфія / Укл. *В.Кіпель, З.Саўка*. — Нью Ёрк; Менск, [2002]. — XXXVIII, 568 с.

чэнні вылучаныя тут паўтоўстым шрыфтам і размешчаныя ў алфавітным парадку. Сінонімы, а таксама варыянты напісання аддзяляюцца адзін ад аднаго касяком. Беларускія эквіваленты ў гэтай частцы набраныя простым светлым шрыфтам, розныя іх значэнні нумаруюцца лічбамі і адасабляюцца кропкай з коскай. Пазнака *гл.* пры скаротах адсылае да поўнага словазлучэння, дзе і пададзены беларускі адпаведнік. Неабходныя ў слоўнікавым артыкуле тлумачэнні, удакладненні або дэфініцыі вылучаныя курсівам. З увагі на чытацкую аўдыторыю мы ў абедзвюх частках падаем іх па-беларуску.

У беларуска-ангельскай частцы слоўніка ў інтарэсах карыстальнікаў ужытая алфавітна-гнездавая будова. Складаныя тэрміны, якія ўяўляюць сабою спалучэнне двух і больш словаў, аб'ядноўваюцца па галоўным слове. Калі гэта назоўнік, то ён скарачаецца да пачатковай літары, калі дзеяслоў — замест яго ставіцца тыльда. У межах слоўнікавага артыкула-гнязда захоўваецца алфавітны парадак. Характар такіх гнёздаў розны: некаторыя аб'ядноўваюць аднародныя паняцці, іншыя ж сфармаваныя паводле прынцыпу лексічнай спалучальнасці. Нейкія з іх атрымаліся даволі груваасткія, але гэтая аб'ёмнасць кампенсуецца зручнасцю ў аглядзе матэрыялу, які складае з галоўным словам пэўнае тэрміналагічнае адзінства.

Наш слоўнік, зразумела, не прэтэндуе на вычарпальнасць, бо задуманы як практычны даведнік. Спадзяемся, што ён будзе карысны ўсім, хто ўдзельнічае ў стварэнні кнігі і давядзенні яе да чытача, а таксама тым, хто яшчэ вучыцца, намерваючыся ўвайсці ў гэтую карпарацыю. Мяркуем таксама, што слоўнік паспрыяе далейшаму развіццю і спарадкаванню беларускай тэрміналогіі ў выдавецкай і друкарскай справе.

# частка

*ангельска-беларуская*

# A

**A format paperback** кніга ў папяровай вокладцы (*фармат 178x111 мм*)
**AAs** гл. *author's alterations*
**abbreviation** скарот
**abrasion resistance** супраціў сціранню
**abridged** скарочаны (*тэкст, выданне*)
**abridgement** скарочаны варыянт
**absorbency** паглынальная здольнасць (*паперы*)
**abstract** рэферат
**abstractor** рэцэнзент
**academic bodies** акадэмічныя колы
**academic publication** акадэмічнае выданне
**accent** 1) націск; 2) пазнака націску
**accentuation** вылучэнні тэксту (*курсіў, разрадка, паўтоўсты, капітэль і г.д.*)
**accept** прымаць (*прапанову*)
**acceptance** прынядце, прыманне
**access** доступ
**accordion fold** фальцаванне гармонікам
**account** рахунак (*банкаўскі*)
**accountant** бухгалтар
**accounts payable** запазычанасць
**accounts receivable** сумы да выплаты
**acetate** празрыстая аснова для мантажу
**achromatic** бясколерны/ахраматычны
**achromatic separations** ахраматычны колерападзел
**acid-free paper** бескіслінная папера
**acknowledgement** 1) падзяка; 2) паведамленне (*пра атрыманне*)
**acoustic coupler** акустычны мадэм
**acquire** набываць
**acronym** абрэвіятура
**ACs** гл. *author's corrections*
**action for libel/libel action** справа пра паклёп (*судовая*)
**acute accent** пазнака націску справа налева
**ad** гл. *advert*
**adapt** адаптаваць
**adaptation** адаптацыя
**addendum** 1) дадатак да кнігі; 2) спіс памылак
**address list** спіс адрасоў
**addressee** 1) адрасат; 2) атрымальнік
**adhesive** 1) клей; 2) налепка/ліпкая этыкетка
**adhesive** клейкі, ліпкі
**adhesive binding** клеевае змацаванне блока
**admin** адміністрацыйная праца
**administer** кіраваць (*справамі*)
**administration** 1) кіраванне (*справамі*); 2) адміністрацыя
**administrative** адміністрацыйны
**adopt** успрымаць (*прымаць*)
**advance** аванс
**advance copy** сігнальны паасобнік
**advance sheets** 1) прэпрынт; 2) чыстыя аркушы
**advert/advertisement** 1) абвестка/анонс; 2) рэклама
**advertise** 1) анансаваць; 2) рэкламаваць
**advertising** 1) рэклама; 2) рэкламны бізнэс
**advertising agency** рэкламнае агенцтва
**advertising band** рэкламны паясок
**advertising campaign** рэкламная кампанія
**advertising copy** 1) тэкст рэкламы; 2) рэкламная ўлётка
**advertising rates** выдаткі на рэкламу
**advertising space** рэкламная палоса
**advice note** паведамленне
**affair** справа
**afterword** пасляслоўе
**against the grain** упоперак валокнаў
**agency** 1) прадстаўніцтва; 2) пасярэдніцтва
**agent** 1) агент; 2) прадстаўнік; 3) пасярэднік; 4) давераная асоба
**agree** пагаджацца

**agreement** пагадненне (*вуснае або пісьмовае*)
**airbrush** 1) аэрограф; 2) рэтушаваць з дапамогай аэрографа
**air freight** адпраўленне груза самалётам
**airfreight** адпраўляць груз самалётам
**alias** псеўданім
**align** лінаваць радок
**alignment** 1) лінаванне радка; 2) сумяшчаць (*выявы*); 3) рэгуляванне; 4) міжрадковы прагал
**all-in** тэкст, падрыхтаваны для набору
**all rights reserved** усе правы ахоўваюцца
**alphabet** 1) алфавіт; 2) шрыфт
**alphabet length** даўжыня шрыфту (*у пунктах*)
**alphabetic character set** камплект шрыфту (*у друкарні*)
**alphabetical** алфавітны
**alphanumeric** алфавітна-лічбавы/літарна-лічбавы
**alter** мяняць
**alteration** змяненне/выпраўленне
**amend** выпраўляць/удасканальваць
**amendment** 1) праўка; 2) рэдагаванне тэксту; 3) папраўленая версія
**americanization** амерыканізацыя
**ampersand (=and)** знак & (*злучнік "і"*)
**analyse/analyze** 1) вывучаць; 2) аналізаваць
**analysis** 1) вывучэнне; 2) аналіз
**ancient book** антыкварная кніга
**annex** дадатак
**anniversary edition** юбілейнае выданне
**annotate** 1) анатаваць; 2) дадаваць каментары
**annotated text** анатаваны тэкст
**annotation** анатацыя
**annual** 1) штогоднік; 2) гадавы (*штогадовы*)
**annual report** штогадовая справаздача
**anon/anonymous** ананімны
**anthology** анталогія
**anti-setoff spray** 1) супрацьзабруджвальны сродак; 2) супрацьзабруджвальны парашковы распыляльнік
**apostrophe** апостраф
**appendix** дадатак
**applications software** ужытковая праграма (*праграмнае забеспячэнне*)
**appraisal** рэцэнзія
**approval** 1) зацвярджэнне; 2) ухваленне
**approval copy** кантрольны (*спробны*) паасобнік
**approve** 1) зацвярджаць; 2) ухваляць
**Arabic numerals/Arabic figures** індаарабскія лічбы
**archive** архіў
**area** плошча
**art board** кардон для мастацкага друку
**art editor** мастацкі рэдактар
**art paper** глянцавая папера для мастацкага друку
**article** 1) артыкул; 2) пункт (*параграф*)
**articles of association** статут асацыяцыі
**artwork (a/w)** арыгінал (*выяўленчы*)
**ascender** верхні вынасны элемент літары
**ASCII** амерыканскі стандартны код для абмену інфармацыяй
**ASCII file** файл, закадаваны ASCII
**assembling** камплектаванне (*кніжнага блока*)
**assembly** 1) камплект/блок; 2) кампанаванне; 3) шыхтаванне (*выявы*)
**assign** даручаць
**assignment** 1) абавязак; 2) даручэнне
**assistant** памочнік/асістэнт
**association** асацыяцыя
**asterisk** зорачка (*знак для пазначэння зносак і вынасак*)
**atlas** атлас
**audio-visual (AV)** аўдыёвізуальны

**author** 1) аўтар; 2) быць аўтарам
**author promotion tour** рэкламная выправа аўтара (*з мэтаю прамоцыі кнігі*)
**author questionnaire** апытальнік для аўтара (*стандартная анкета выдавецтва для атрымання інфармацыі пра аўтара з мэтаю арганізацыі маркетынгу*)
**authorless publication** ананімнае выданне
**author's agent** пасярэднік/літаратурны агент
**author's alterations (AAs)** аўтарская праўка
**author's contract** аўтарскае пагадненне/аўтарская дамова
**author's copy** аўтарскі паасобнік
**author's corrections (ACs)** 1) аўтарская праўка; 2) аўтарская карэктура
**authorization** дазвол/санкцыя
**authorized** аўтарызаваны
**authorship** аўтарства
**autobiography** аўтабіяграфія
**automatic** аўтаматычны
**automatic hyphenation and justification** аўтаматычны перанос і выключка
**automatic page make-up** аўтаматычная вёрстка па палосах
**autopositive film** пазітыўная фотаплёнка
**AV** гл. *audio-visual*
**availability** даступнасць
**a/w** гл. *artwork*
**award** прэмія/узнагарода

# B

**B format paperback** кніга ў папяровай вокладцы фармату B (*198x129 мм*)
**b & w** гл. *black and white*
**back** спінка аправы
**back copy** стары нумар (*газеты, часопіса*)
**back cover** задняя старонка вокладкі
**back flap** задні клапан
**back jacket flap** задні клапан супервокладкі
**back lining** абклейка спінкі блока
**back margin** нутраное поле
**back matter** 1) апарат выдання; 2) дашыхтоўванне (*пры канцы кнігі*)
**back number** стары нумар (*газеты, часопіса*)
**back of inner book** спінка кніжнага блока
**back orders** нявыкананыя замовы
**back up** 1) рабіць рэзервовую копію; 2) капіяваць файл
**backbone** спінка вечка аправы
**backdate** пазначаць мінулай датай
**background** фон/задні план
**backlist** спіс кніг у асартыменце (*выдавецтва*)
**backlog** нявыкананая праца
**bad break** няправільны перанос слова
**bad copy** неразборлівы тэкст
**bad debt** безнадзейная запазычанасць
**balance sheet** баланс (*фінансавы*)
**bale package** стос паперы
**banding/bands** бінты (*рэльефныя папярочныя палоскі на спінцы аправы*)
**bank account** банкаўскі рахунак
**bank draft** 1) банкаўскі чэк; 2) трата
**banner/banner headline** сцяг (*рубрыка ўверсе прагалу спускавой палосы*)
**bar code/bar graphics** штрых-код
**base** 1) база; 2) зыходнае становішча; 3) аснова; 4) падстаўка (*для клішэ*)
**base alignment** выроўніванне знакаў (*па лініі шрыфту*)
**base line** лінія шрыфту
**base paper** папера (*у якасці асновы*)
**bastard title** шмуцтытул/нутраны тытул

**be in debt** быць вінным/мець доўг
**bead** каптал
**belles-lettres edition** літаратурна-мастацкае выданне
**Berne Convention** Бэрнская канвенцыя (*па ахове аўтарскіх правоў*)
**bestseller** бэстсэлер
**bf** гл. *bold-faced type*
**Bible paper** папера "біблыдрук"
**biblio** адгорт тытула (*тытульнай старонкі*)
**bibliographical description/bibliographical entry** бібліяграфічнае апісанне
**bibliographical reference** бібліяграфічная спасылка
**bibliography** бібліяграфія
**bid** 1) прапанова цаны; 2) прапаноўваць цану (*на аўкцыёне*)
**bilingual** дзвюхмоўны
**bill** 1) афіша; 2) рахунак; 3) выстаўляць рахунак
**bill of exchange** 1) вэксаль; 2) трата
**bill of lading** 1) накладная; 2) канасамент
**bimetal plate/bimetallic plate** біметалічная друкарская форма
**binary system** двайковая сістэма
**bind** сшываць/змацоўваць (*блок*)
**binder** 1) шытар (*той, хто робіць аправу*); 2) звязнік (*сувязная дэталь*); 3) апарат для змацавання (*кніжнага блока*)
**bindery** кнігашытня (*майстэрня*)
**binding** 1) аправа (*трывалае пакрыццё, у якое ўстаўляецца кніжны блок*); 2) брашураванне; 3) сшытаванне
**binding board** кардон для аправы
**biography** біяграфія
**bit** двайковы разрад/біт
**black** пляміна (*дэфект друку*)
**black and white (b & w)** 1) чорна-белы; 2) абрысавы
**black box** чорная скрыня
**black plate/black printer** 1) форма для друку чорнай фарбай; 2) негатыў для чорнай фарбы
**blad** аб'ёмны макет (*кнігі*)
**blade coating** нанясенне пакрыцця ракельным нажом
**blank** 1) прагал (*прамежак паміж словамі, групамі радкоў, выяўленчымі элементамі*); 2) пусты/незапоўнены
**blanket agreement** пагадненне, якое ахоплівае ўсе сферы
**bleed** 1) макет старонкі з ілюстрацыямі пад абрэз; 2) ілюстрацыі пад абрэз
**bleed off** абразаць па краі (*кнігу*)
**blind blocking/blind embossing/blind stamping** сляпое цісненне
**blind spot** сляпы друк (*дэфект друку*)
**blister pack** блістэрная ўпакоўка
**block** кліша (*форма для высокага друку*)
**block capitals/block letters** загалоўныя літары
**block in** рабіць чарнавы накід
**block out** 1) маскаваць; 2) замазваць элементы на арыгінале
**blocking** 1) цісненне (*фарбавае*); 2) зліпанне (*у стосе*)
**blow up** павялічваць (*выяву*)
**blow-up** павялічаная выява
**blueprint** светлакопія/"сінька"
**blurb** рэклама на вокладцы (*або супервокладцы*)
**board** 1) старонка вечка аправы (*аркуш кардону фармату выдання*); 2) плата (*дэталь кампутара з інтэгральнымі схемамі ды іншымі паўправадніковымі прыладамі*)
**board of directors** дырэкцыя (*рада дырэктараў*)
**board of editors** рэдакцыйная калегія
**boards (front board and back board)** старонкі вечка аправы з кардону (*пярэдняя і задняя*)
**body** асноўны тэкст
**body matter** асноўны набор тэксту
**body size** кегель шрыфту асноўнага тэксту

**bold** тоўсты
**bold-faced type/boldface (bf)** паўтоўсты шрыфт
**book** кніга
**book artist/book designer** мастак кнігі
**book auction** 1) кніжны аўкцыён; 2) аўкцыён правоў на выданне; 3) прадаваць з аўкцыёна
**book band** рэкламны паясок
**book block** кніжны блок
**book box** футарал для кнігі
**book chamber** кніжная палата
**book club** кніжны клуб
**book club edition** выданне для кніжнага клуба
**book club rights** права на выданне кнігі ў клубнай серыі
**book cover** 1) аправа; 2) вечка аправы
**book cover grooving** штрыхаванне (*выраб паглыблення паміж адставам і старонкай на аправе*)
**book-edge trimming** абразанне кніжнага блока
**book fair** кніжны кірмаш
**book of problems** задачнік
**bookjacket** вокладка
**book marker** закладка
**book plate** экслібрыс
**book proofs** 1) сігнальны паасобнік; 2) спробны адбітак кнігі
**book token** дароўны квіток на куплю або атрыманне кнігі
**the book trade** кніжны гандаль
**book wrapper** вокладка
**bookbinder** 1) шытар (*той, хто робіць аправу*); 2) кнігашытня (*майстэрня*)
**bookbinding** 1) шытарства; 2) брашуравальна-апраўныя працэсы
**bookblock cracking** разлом кніжнага блока
**booklet** 1) буклет; 2) брашура
**bookmark** бібліятэчны знак
**bookmarker** закладка
**books sent on consignment** кансігнацыйныя кнігі (*прадаюцца на ўмовах камісіі*)
**bookseller** гандляр кнігамі
**bookshop** кнігарня
**book trade (the)** кнігагандаль
**booth** стэнд
**border** 1) край (*дэкаратыўная рыса па краях клішэ*); 2) поле старонкі; 3) мяжа
**bottom margin** 1) ніжняе поле; 2) “хвосцік” (*палосы*)
**bottom note** падрадкоўнік (*зноска*)
**bought ledger** кніга выдаткаў
**bound copies** змацаваныя адбіткі
**bourgeois** боргес (*шрыфт кегелю 9 пунктаў*)
**boxed set** камплект кніг у скрынцы
**brace** фігурная дужка
**brackets** дужкі
**Braille** 1) друк для сляпых; 2) шрыфт Брайля
**brass** латунь
**breach of contract** парушэнне кантракту
**break** абзац
**break even** акупляць
**breakeven point** акупнасць
**brightness** белізна (*паперы*)
**bring forward** перанесці на больш ранні тэрмін
**broadcasting rights** права на выкарыстанне на радыё або тэлебачанні
**brochure** 1) брашура; 2) улётка
**broke** макулатура
**bromide** бромсрэбная (*бромістая*) фотапапера
**bromide print** адбітак на бромсрэбнай фотапаперы
**bronzing** бранзаванне
**buckle folder** касетны апарат для фальцавання
**buckle folding** касетнае фальцаванне
**buckram** 1) клеенае палатно; 2) цвёрдая аправа
**budget** 1) бюджэт; 2) складаць бюджэт
**bulk** 1) асноўная маса (*накладу*); 2) таўшчыня блока (*кнігі*)
**bulk buying/bulk purchase** гуртавая купля

**bulk order** гуртавая замова
**bulk stock** складаваны наклад
**bulking dummy** аб'ёмны макет выдання
**bulky** 1) пухкі (*пра паперу*); 2) аб'ёмны (*пра выданне*)
**bullet** чорны кружок (*наборны знак*)
**bulletin** бюлетэнь
**bundling** 1) абцісканне і звязванне (*сшыткаў у пачкі*); 2) звязванне пачкаў
**burst binding** клеевае змацаванне блока з таршанаваннем (*спінак сшыткаў*)
**buy** купляць
**buy in** купляць гатовую кнігу (*каб выдаваць яе*)
**buyer** пакупнік
**buying around** купля партыі па ніжэйшых цэнах (*што парушае права на эксклюзіўны продаж*)
**byte** байт

# C

**C format paperback** кніга ў папяровай вокладцы фармату C (*234x156 мм*)
**CAD** гл. *computer-aided design*
**calendar** каляндар
**calendar year** каляндарны год
**calender** 1) каляндэр; 2) каляндэраваць
**calendered paper** каляндэраваная папера
**calf** цялячая скура
**caliper** 1) таўшчыня аркуша (*паперы*); 2) вымяральнік таўшчыні
**call number** шыфры выдання
**calligraphy** каліграфія
**camera** рэпрадукцыйны апарат
**camera ready copy (CRC)/**
**camera-ready paste-up (CRPU)** арыгінал-макет, падрыхтаваны для рэпрадукавання
**cancel** 1) адмяняць; 2) замяняць (*бракаваную старонку*)
**cancellation** 1) адмена; 2) скончэнне тэрмінаў пастаўкі (*тавараў або паслуг*)
**cap** загалоўная літара
**cap height** вышыня загалоўнай літары
**capital** капітал
**capital equipment** абсталяванне прадпрыемства
**capital expenditure** актывы
**capital letters/caps** загалоўныя літары
**caps and lower case (caps & lc)** друк загалоўнымі і радковымі літарамі
**caps and small caps (caps & sc)/caps and smalls** друк загалоўнымі літарамі і капітэлямі
**caption** подпіс да ілюстрацыі
**carbon paper** капіявальная папера
**card** шчыльная папера
**cardboard** тонкі кардон (*папера высокай шчыльнасці*)
**care of (c/o)** перадаць (*пэўнай асобе; надпіс на канверце*)
**carriage** перавозка
**carriage costs** транспартныя выдаткі
**carriage paid** перавозка, аплочаная прадаўцом
**carrier** 1) транспартная кампанія; 2) кур'ер
**cartographic publication** картаграфічнае выданне
**cartography** картаграфія
**carton** кардонная скрынка
**cartridge paper** папера для рысавання ці вокладкі
**case** 1) старонка вечка аправы; 2) скрынка для ўпакоўкі (*кардонная або драўляная*); 3) футарал
**case** 1) упакоўваць (*у скрынку*); 2) апраўляць (*змацоўваць кніжны блок з вечкам аправы*)
**casebound/cased book** кніга ў апраўе
**cased binding** вечка аправы
**casing/casing-in** 1) апраўленне (*змацаванне кніжнага блока з вечкам аправы*); 2) крыццё (*прыклейванне вокладкі да кніжнага блока*)

**cash flow** адмоўны аплатны баланс
**cash on delivery (COD/c.o.d.)** 1) аплата пры атрыманні; 2) накладная плата
**cassette (tape)** касета (*з магнітнай стужкай*)
**cast off** 1) падлічваць (*плошчу набору з дадзенай гарнітурай*); 2) падлік (*плошчы набору з дадзенай гарнітурай*)
**cast-coated paper** глянцавая крэйдаваная папера
**casting off/casting up** падлік (*аб'ёму або кошту набору*)
**catalog/catalogue** 1) каталог; 2) уносіць у каталог
**catchword** калонтытул
**cathode ray tube (CRT)** электроннапрамянёвая трубка
**CD** гл. *compact disk*
**CD-R** гл. *compact disk recordable*
**CD-ROM** гл. *compact disk read-only memory*
**CD-ROM player** (*прылада для чытання кампакт-дыскаў*) чытальнік
**CD-RW** гл. *compact disk re-writeable*
**center spread** разгорт
**centre/center** 1) цэнтр; 2) цэнтраваць/ставіць на цэнтр
**certificate of origin** сертыфікат (*пасведчанне*) паходжання
**chain store** сетка крамаў аднаго ўладальніка
**chapter** раздзел
**chapter head/chapter heading/chapter title** назоў раздзела
**character** 1) літара/знак; 2) шрыфт (*канфігурацыя літар ды іншых знакаў*); 3) герой/дзейная асоба
**character count** падлік знакаў (*у радку*)
**character recognition** распазнаванне знакаў і сімвалаў
**character set** 1) камплект шрыфту; 2) набор сімвалаў
**characters per inch (cpi)** колькасць друкаваных знакаў на цалю
**characters per line (cpl)** колькасць знакаў у радку
**characters per second (cps)** колькасць знакаў (*якія перадаюцца або друкуюцца*) у секунду
**charge** 1) цана паслугі; 2) прызначаць цану за паслугі
**chart** рысунак (*графік, дыяграма, схема*)
**cheap edition** таннае выданне
**check digit** кантрольная лічба
**chemac** штамп для аправы
**chemical (wood) pulp** драўнінная цэлюлоза
**chief editor** галоўны рэдактар
**chief of editorial office** загадчык рэдакцыі
**chipboard** заменнік кардону
**c.i.f. (cost, insurance and freight)** СІФ (*кошт, страхаванне і фрахт*)
**circular letter** цыркулярны ліст
**circulation** 1) абарачэнне; 2) наклад
**circumflex accent** знак націску "стрэшкай"
**citation** цытата
**classified advertisements** тэматычныя аб'явы
**clause** пункт (*артыкул дамовы*)
**clean proof** чыстыя аркушы
**close up** карэктурная пазнака "зменшыць прагал" (*паміж часткамі слова*)
**closed market** закрыты рынак
**closeup фота** буйным планам
**cloth** тканіна для аправы
**clothbound** кніга, апраўленая тканінай (*імітацыяй тканіны*)
**CMYK** (*cyan, magenta, yellow, key*) базавыя колеры (*сіні, чырвоны, жоўты, чорны*)
**c/o** гл. *care of*
**co-** прыстаўка, якая азначае "супольна"
**co-edition** супольнае выданне
**coated paper** крэйдаваная папера
**coating** крэйдаванне
**coauthor** 1) суаўтар; 2) пісаць у суаўтарстве

**code** код
**coffee table book** кніга (*ілюстраваная*) на століку для наведнікаў
**cold call** візіт (*прадаўца да незнаёмага кліента*) без дамоўленасці
**collaborate** супрацоўнічаць
**collaboration** супрацоўніцтва
**collate** правяраць падборку сшыткаў
**collating** камплектаванне (*кніжнага блока*)
**collating mark** кантрольная пазнака для камплектавання
**collecting** падборка (*камплектаванне накладкай*)
**collection** зборнік
**collective authorship** калектыўнае аўтарства
**collector's edition** бібліяфільскае выданне
**college bookstore** кнігарня навучальнай літаратуры
**colloguial guide** размоўнік
**collotype** фотатыпія (*бязрастравы спосаб друку*)
**colon** двукроп'е
**colophon** 1) пасляслоўе; 2) выхадныя звесткі (*у старадруках*)
**colour/color** колер
**colour bar** кантрольная колеравая палоса
**colour chart/colour separation set** шкальны адбітак (*фарбаў*)
**colour correction** карэкцыя колеру
**colour film** каляровы слайд
**colour plate** клішэ для шматколернага друку
**colour separation** колерападзел
**colour swatch** узор колеру
**colour transparency (C/T)** каляровы дыяпазітыў
**coloured edge** фарбаваны абрэз кнігі
**coloured top** фарбаваны верхні абрэз кнігі
**column** калонка
**column rule** калонлінейка
**column-centimetre** даўжыня калонкі ў сантыметрах
**column-inch** даўжыня калонкі ў цалях
**coming-and-going** падвойны друк
**comma** коска
**commentary** каментар
**comments** заўвагі
**commercial** 1) рэклама па тэлебачанні; 2) камерцыйны/гандлёвы
**commercial publication** фірмовае выданне
**commission** 1) замова; 2) рабіць замову; 3) камісійныя выплаты
**commission agent** камісійны агент
**commissioning editor** 1) рэдактар-замоўца; 2) рэдактар-канцэптуаліст
**compact disk (CD)** кампакт-дыск
**compact disk read-only memory (CD-ROM)** кампакт-дыск толькі для счытвання
**compact disk recordable (CD-R)** кампакт-дыск для аднаразовага запісвання
**compact disk re-writeable (CD-RW)** кампакт-дыск для шматразовага запісвання
**comparing** счытванне
**compatibility** сумяшчальнасць
**compatible** сумяшчальны
**competing titles** кнігі-спаборнікі (*выданні адной і той жа кнігі, якія ажыццяўляюцца рознымі выдавецтвамі і прадаюцца на адных і тых жа рынках па блізкіх цэнах*)
**competition** спаборніцтва/канкурэнцыя
**compilation** 1) кампіляцыя; 2) укладанне
**compiler** укладальнік
**complementary colours** дадатковыя колеры
**complete works** збор твораў
**complimentary copy** аўтарскі паасобнік
**compose** набіраць
**composed matter** набраны матэрыял (*тэкст, формулы, табліцы і г.д.*)

**composition** набор (*працэс*)
**compositor** наборнік (*аператар набору*)
**compulsory copy** абавязковы паасобнік
**computer** кампутар
**computer error** памылка кампутара
**computer graphics** кампутарная графіка
**computer hardware** апаратнае забеспячэнне
**computer listing** кампутарная раздрукоўка
**computer system** кампутарная сістэма
**computer typesetting** кампутарны або аўтаматызаваны набор
**computer-aided design (CAD)** аўтаматызаванае праектаванне
**computer-generated** створаны з дапамогай кампутара
**concertina fold** фальцаванне гармонікам
**conclusion** заканчэнне (*завяршальная частка твора*)
**condensed** вузкі/шчыльны (*шрыфт*)
**condition** умова
**conditions of sale** умовы продажу
**conglomerate** аб'яднанне
**conjecture** кан'ектура (*у тэксталогіі — рэканструкцыя дэфектнага тэксту*)
**consignment** кансігнацыя
**consignment note** накладная
**consistency** 1) кансістэнцыя; 2) шчыльнасць; 3) паслядоўнасць; 4) стабільнасць
**consolidated shipment** зборная пасылка
**consortium** кансорцыум
**consultant** кансультант
**contact print** кантактны друк
**contact screen** кантактны растр
**container** кантэйнер
**containerization** перавозка ў кантэйнерах
**containerize** перавозіць у кантэйнерах
**contents/contents list** змест
**contents page** старонка зместу
**continued publication** выданне з працягам
**continuous stationery** рулонная папера для друкарак (*прынтэраў*)
**continuous tone/contone** 1) тон без рэзкіх пераходаў; 2) нерастраваная выява
**contract** 1) кантракт/дамова; 2) падпісваць кантракт
**contract prolongation** падаўжэнне дамовы
**contrast** кантраст
**contribution** артыкул (*для газеты ці часопіса*)
**contributor** 1) сталы супрацоўнік (*газеты, часопіса*); 2) аўтар артыкула (*у зборніку, часопісе, энцыклапедыі*)
**control** 1) кантроль; 2) кіраванне; 3) рэгуляванне; 4) кантраляваць; 5) кіраваць; 6) стрымліваць
**control copy** кантрольны паасобнік
**conventional printed sheet** умоўны друкаваны аркуш
**coordinate** каардынаваць
**coproduction** супольная вытворчасць
**copublication** супольная публікацыя
**copy** 1) арыгінал; 2) копія; 3) капіяваць; 4) паасобнік (*кнігі, часопіса*)
**copy editing** выдавецкая падрыхтоўка рукапісу
**copy editor** выдавецкі рэдактар (*рэдактар, які рыхтуе рукапіс да друку*)
**copy fitting** 1) разлік палосы набору; 2) уціскание або разгонка тэксту (*на зададзены фармат*)
**copy for the cover** тэкст на вокладку
**copy-holder** падчытвальнік (*карэктар, які выконвае падчытванне*)
**copy-holding** падчытванне
**copy prep/copy preparation** вычытванне (*арыгінала*)
**copyright** 1) аўтарскае права; 2) пацвярджаць аўтарскае права (*паведамленнем у кнізе*); 3) ахоўваецца аўтарскім правам

**copyright fee** плата за права ўзнаўлення твораў (*якія ахоўваюцца аўтарскім правам*)
**copyright infringement** парушэнне аўтарскіх правоў
**copyright law** закон пра аўтарскае права
**copyright notice** паведамленне аб ахове аўтарскага права
**copyright sign** знак аховы аўтарскага права ©
**copywriter** складальнік тэксту для рэкламы
**copywriting** складанне тэксту для рэкламы
**corporate authors** аўтарскі калектыў
**correction** 1) карэктура; 2) праўка
**correction marks** карэктурныя знакі
**corrigenda** спіс памылак
**cost** 1) сабекошт; 2) цана; 3) кошт; 4) пралічваць кошт; 5) каштаваць
**cost price** цана продажу, роўная сабекошту
**cost-cutting** скарочаны (*пра выдаткі*)
**cost-effective** выгадны
**costing** падлік цаны продажу
**counter pack** паліца для паказу кніг у кнігарні
**courier** 1) кур'ер; 2) перадаваць праз кур'ера
**course book** падручнік
**cover** 1) вокладка; 2) аправа; 3) пакрываць вокладкай; 4) апраўляць
**cover copy** тэкст на вокладку
**cover costs** пакрываць выдаткі/акупляць
**cover design** эскіз вокладкі
**cover material** покрыўны матэрыял (*для вокладкі або аправы*)
**cover price** раздробная цана (*кнігі*)
**covering letter/covering note** дакумент, які пацвярджае адпраўку тавару
**cpi** гл. *characters per inch*
**cpl** гл. *characters per line*
**cps** гл. *characters per second*
**CRC** гл. *camera-ready copy*
**crease** 1) згін; 2) складка (*дэфект*) на роўнай паперы; 3) бігаваць; 4) рабіць складку (*дэфект*) на роўнай паперы
**creasing** бігаванне
**credit** 1) паступленне (*грошай на рахунак*); 2) адзначэнне аховы правоў аўтара, мастака, фатографа і г.д.; 3) паказваць уладальніка аўтарскіх правоў аўтара, мастака, фатографа і г.д.
**credit balance** станоўчы баланс
**credit control** крэдытны кантроль
**credit limit** ліміт крэдыту
**credit line** радок прыналежнасці (*дзе называюцца аўтар, мастак, фатограф або арганізацыя, што далі ілюстрацыю*)
**credit note** крэдыт-нота
**credit-worthy** крэдытаздольны
**creditor** крэдытор
**critical review** рэцэнзія
**crop** 1) абразаць ілюстрацыю/кадраваць; 2) "заразаць край"
**cropping** абрэзка (*непатрэбных частак*) ілюстрацыі/кадраванне
**cross-reference** 1) крыжаваная спасылка (*спасылка на іншае месца ў той жа кнізе*); 2) рабіць крыжаваную спасылку
**crosshead/crossheading** уразны падзагаловак
**CRPU** гл. *camera-ready paste-up*
**CRT** гл. *cathode ray tube*
**C/T** гл. *colour transparency*
**cumulative index** зборны паказальнік
**cursor** курсор
**customer** 1) пакупнік; 2) кліент
**customer file** картатэка для рэгістрацыі (*пакупнікоў, замоўцаў*)
**customer service department** аддзел рэалізацыі
**customs** мытня
**customs clearance** мытны дазвол

**customs duty** мыта
**cut** 1) скарачэнне тэксту або ілюстрацыі; 2) гравюра; 3) рэзкая паніжка (цэнаў, заработнай платы, занятасці); 4) скарачаць (*тэкст, ілюстрацыю*); 5) рэзка паніжаць
**cut and paste** 1) мантаж арыгіналаў шляхам наклейвання; 2) перастаноўка часткі тэксту (*пры апрацоўцы на камп'ютары*)
**cut flush** абрэзванне краёў кнігі (*разам з вокладкай*)
**cut line** подпіс да ілюстрацыі
**cyan** цыян/сіні (*колер у трыядзе*)
**cylinder** цыліндр
**cylinder press** плоскадрукавальная машына
**Cyrillic alphabet** кірыліца (*славянскі алфавіт*)

# D

**dagger** "крыжык" (*друкарскі знак*)
**daisy-wheel** пялёсткавы шрыфтаносьбіт (*"рамонак"*)
**daisy-wheel printer** друкавальная прылада з пялёсткавым шрыфтаносьбітам (*"рамонкам"*)
**dash** 1) працяжнік; 2) рыса/штрых
**data** дадзеныя/інфармацыя
**data capture** увядзенне дадзеных
**data processing (DP)** апрацоўка інфармацыі
**database** база дадзеных
**database publishing** база дадзеных для выпуску выдавецкай прадукцыі
**date of publication** 1) тэрмін выдання (*выпуску*) кнігі; 2) дата паступлення ў продаж; 3) дзень выпуску (*газеты, часопіса*)
**DD** гл. *double density disk*
**de luxe edition** раскошнае выданне
**deadline** крайні тэрмін (*выканання працы*)
**deal** 1) угода; 2) пагадненне
**deal with** весці гандлёвы бізнэс (*з кімнебудзь*)
**dealer** дылер (*агент па куплі і продажы*)
**debit** дэбет
**debit and credit** дэбет і крэдыт
**debit note** дэбет-нота
**debt** запазычанасць (*доўг*)
**debtor** пазычальнік (*той, хто вінны доўг*)
**deckle** 1) край; 2) шырыня аркуша (*які выходзіць з варштата паперні*)
**dedicate** 1) прысвячаць (*каму-небудзь*); 2) выкарыстоўваць мэтава (*толькі для вызначанай мэты*)
**dedication** прысвячэнне
**defective copy** дэфектны паасобнік
**deink** 1) ачышчаць ад фарбы; 2) выдаляць друкарскую фарбу з паперы пры перапрацоўцы макулатуры
**delete** 1) выкрэсліваць; 2) сціраць (*запіс*)
**deletion** 1) выкрэсліванне; 2) сціранне (*запісу*); 3) выкасаванае
**delivery** здача (*рукапісу*) у выдавецтва
**delivery date** дата здачы (*рукапісу*)
**delivery instructions** інструкцыі друкару або шытару
**delivery note** ведамасць выпуску
**demand** 1) патрэба; 2) попыт; 3) патрабаванне (*аплаты*); 4) патрабаваць
**density** 1) аптычная шчыльнасць; 2) шчыльнасць пачарнення (*адбітка*)
**department (dept)** 1) бюро; 2) аддзел; 3) цэх
**department head/department manager** загадчык аддзела
**depreciation** уцэнка
**dept** гл. *department*
**depth of page** даўжыня палосы набору (*ад загалоўка ці калонтытула да калонлічбы*)
**descender** ніжні вынасны элемент літары
**design** 1) афармленне выдання; 2) эскіз (*будучай кнігі, старонкі або вокладкі*); 3) распрацоўваць/праектаваць

**designer** 1) канструктар; 2) дызайнер
**desk editor** выдавецкі рэдактар
**desktop publishing (DTP)** настольная выдавецкая сістэма
**despatch** 1) адпраўленне тавару кліенту; 2) адпраўляць тавар кліенту
**Dewey decimal classification** дзесятковая класіфікацыя Д'юі
**diacritical marks/diacriticals/ diacritics** дыякрытычныя знакі
**diaeresis/dieresis** трэма (*дзве кропкі над галоснай*)/умляўт
**diagram** 1) дыяграма/схема/графік; 2) макет (*схема*) шыхтавання
**diapositive** дыяпазітыў
**dictionary** слоўнік
**die** словалітная матрыца
**die stamping** 1) цісненне (*штампам*); 2) высечка (*штампам*); 3) тампадрук
**digest** 1) агляд; 2) дайджэст; 3) зборнік
**digipad** прылада для ўвядзення графічных дадзеных
**digital computer** лічбавая вылічальная машына
**digitize** пераводзіць у лічбавую форму (*праводзіць лічбавае кадаванне*)
**dimension** памер
**diphthong** дыфтонг
**diplomatic edition** дыпламатычнае выданне
**direct** 1) кіраваць; 2) просты (*без перашкодаў*)
**direct access** просты (*беспасярэдні*) доступ
**direct mail** рэклама па пошце
**direct screening** простае растраванне
**direct selling** беспасярэдні продаж (*пакупніку*)
**direct-entry phototypesetting** фотанабор на клавіятуры
**direction** кірунак
**direction line** норма
**directions for use** інструкцыя
**directory** 1) адрасная кніга; 2) даведнік; 3) картатэка кліентаў
**disc/disk** 1) дыск (*магнітны*); 2) дыскета
**disclaimer** адмова (*ад адказнасці*)
**discount** 1) паніжка; 2) рабіць паніжку
**discretion** 1) свабода дзеянняў; 2) выбар
**disk drive** дыскавод
**disk operating system (DOS)** дыскавая аперацыйная сістэма
**dispatch/despatch** 1) адпраўленне тавару кліенту; 2) адпраўляць тавар кліенту
**display** 1) выява тэксту на маніторы; 2) паказ/дэманстрацыя; 3) паказваць; 4) выстаўляць
**display pack/display box** модуль для паказу тавару (*у краме*)
**display stand/display unit** 1) стэнд; 2) вітрына (*для кніг*)
**distribution** распаўсюджванне
**distribution costs** выдаткі на распаўсюджванне
**distribution network** сетка распаўсюджвання (*гандлёвая*)
**distributor** 1) гандлёвая фірма; 2) размеркавальнік (*цыліндр*)
**division** аддзел
**documentary edition** дакументальнае выданне
**door-to-door** раз'язны (*гандаль*)
**DOS** гл. *disk operating system*
**dot** 1) кропка; 2) растравы элемент
**dot etching** падтраўліванне растравых кропак
**dot-for-dot reproduction** растравая рэпрадукцыя паўтонавага адбітка
**dot-matrix printer** матрычная друкарка/матрычны прынтэр
**dots per inch (dpi/d.p.i.)** колькасць кропак на цалю (*раздзяляльная здольнасць растра*)
**double burn** раздзельнае капіяванне (*з прыводкай штрыхавой і растравай выявы*)
**double column** падвойная калонка
**double density** падвойная шчыльнасць запісу

**double density disk (DD)** дыскета з падвойнай шчыльнасцю запісу
**double inverted commas** двукоссе (*"лапкі"*)
**double page spread/double spread** разгорт
**double quotes** 1) двукоссе; 2) браць у двукоссе
**down time** страчаны час
**DP** гл. *data processing*
**dpi/d.p.i.** гл. *dots per inch*
**draft** 1) чарнавік; 2) праект; 3) рабіць накіды
**drawing** 1) малюнак; 2) рысунак
**dress** фальбона (*набор часткі палосы на завужаны фармат для размяшчэння побач малюнкаў, табліц, рубрык*)
**drier/dryer** сушыльная машына
**drill** свідраваць
**drive out** разгонка радкоў (*падвышэнне аб'ёму выдання за кошт павелічэння кегелю, міжрадкоўя, спускаў і г.д.*)
**driver** павадыр (*праграма, якая забяспечвае ўзаемадзеянне камп'ютарных прылад*)
**dropped (chapter) heads** загалоўкі з спускам
**drum scanner** цыліндравы сканэр
**dry-transfer lettering/dry-transfer process** выраб надпісаў з дапамогай пераваднога шрыфту
**dryer/drier** сушыльная машына
**DTP** гл. *desktop publishing*
**due** 1) чаканы; 2) павінны быць
**dues** адкладзеная замова на кнігі (*да паступлення новых*)
**dummy copy** аб'ёмны макет (*кнігі*)
**dump bin** 1) бункер-крама; 2) дэманстрацыйная (*кніжная*) стойка
**duotone** 1) дзвюхфарбавая рэпрадукцыя; 2) дуплекс-аўтатыпія
**duplicate** 1) дублікат; 2) копія; 3) капіяваць; 4) памнажаць
**duplicate a film** рабіць копію плёнкі
**duplicate a letter** памнажаць дакумент
**duplicate film** копія плёнкі
**duplicate title** контртытул
**duplication** рэпрадукаванне
**dust cover/dust jacket/dust wrapper** супервокладка
**dwarf edition** мініяцюрнае выданне
**dye** 1) фарбавальнік/фарба; 2) фарбаваць
**dye-line copying** геліяграфія

# E

**edge** абрэз (*кнігі*)
**edge colouring/edge staining** фарбаванне абрэзу
**edit** рэдагаваць
**editing** літаратурная праўка/рэдагаванне
**editing process** рэдакцыйны працэс
**editing terminal** рэдактарскі тэрмінал
**edition** 1) выданне; 2) наклад; 3) выпуск (*газеты*)
**edition for the blind** выданне для сляпых
**edition in a book form** кніжнае выданне
**editor** рэдактар
**editor-in-chief** галоўны рэдактар
**editorial** 1) рэдактарскі; 2) рэдакцыйны
**editorial correction/editorial revise** рэдактарская праўка
**editorial counsil** рэдакцыйная рада
**editorial department** 1) выдавецкі аддзел; 2) рэдакцыя (*выдавецтва*)
**editorial office** рэдакцыя (*газеты*)
**educational** 1) навучальны; 2) адукацыйны
**educational contractor** выдавецтва, якое выдае навучальную літаратуру
**educational edition** навучальнае выданне

**educational publisher** выдавец навучальнай літаратуры

**electronic composition** электронны набор

**electronic mail (e-mail/email)** электронная пошта

**electronic point of sale/electronic point-of-sale (EPOS)** электронная гандлёвая кропка

**electronic publishing** выданне (*кніг і часопісаў*) у электроннай форме

**electronic scanner** электронны сканэр

**electrostatic printing** электрастатычны друк

**ellipsis** шматкроп'е (*паказвае на адсутнасць часткі тэксту*)

**em** эм (*адзінка шырыні літары*)

**e-mail/email** гл. *electronic mail*

**emboss** выціскаць рэльеф

**emphasis** вылучэнні тэксту

**emulsion** эмульсія

**emulsion side** эмульсійны бок

**en** эн (*палова шырыні эм*)

**encyclopaedia/encyclopedia** энцыклапедыя

**end matter** матэрыял пасля асноўнага тэксту (*кнігі*)

**endnote** вынаска (*заўвага ці бібліяграфічная спасылка пры канцы раздзела або кнігі*)

**endpaper/endsheet** форзац

**engraving** гравюра

**enlarge** павялічваць (*фота*)

**enlarged edition** дапоўненае выданне

**enlargement** павелічэнне (*фота*)

**entitle** 1) даваць права (*на што-небудзь*); 2) называць (*кнігу*)

**entry** артыкул (*у слоўніку, энцыклапедыі, даведніку*)

**epigraph** эпіграф

**epilogue** эпілог

**EPOS** гл. *electronic point of sale*

**errata slip/erratum slip** спіс памылак друку

**erratum** памылка друку

**error** памылка

**essay** эсэ, нарыс

**establish** 1) устаноўліваць; 2) адчыняць/засноўваць

**establishment** прадпрыемства

**estimate** 1) ацэнка; 2) ацэньваць

**estimate for a job** рыхтаваць каштарыс

**estimated** прыблізны/меркаваны

**estimation** ацэнка/папярэдні разлік

**estimator** складальнік каштарысу

**even pages** цотныя старонкі

**even working** кратная (*аркушу*) колькасць старонак

**excerpt** 1) вытрымка (*з тэксту*); 2) асобны адбітак

**exclamation mark** клічнік

**exclusion clause** пункт (*у страхавым полісе або гарантыі*), які змяшчае выняткі

**exclusive agreement** эксклюзіўнае пагадненне

**exclusive right** эксклюзіўнае права

**exemption** вызваленне

**exercise book** задачнік

**exhibition** выстава

**exhibition room/exhibition hall** дэманстрацыйнае памяшканне (*пакой, зала*)

**exhibition stand** дэманстрацыйны стэнд

**exhibitor** удзельнік выставы

**expanded type** шырокі шрыфт

**expense** выдаткі

**expenses** службовыя выдаткі

**expire** сканчацца (*пра тэрмін дзеяння дакумента*)

**expiry date** дата сканчэння

**explication** эксплікацыя/легенда (*тэкст, які тлумачыць значэнне сімвалаў і ўмоўных знакаў на картах, ілюстрацыях, у формулах*)

**exploit** 1) эксплуатаваць; 2) выкарыстоўваць у сваіх інтарэсах

**export** 1) экспарт; 2) экспартныя тавары; 3) экспартаваць

**export edition** экспартнае выданне

**export licence** ліцэнзія на экспарт

**exposure** вытрымка/экспазіцыя (*фота*)
**extended credit** доўгатэрміновы крэдыт
**extension** 1) камутатар; 2) нутраны тэлефон; 3) адтэрміноўка
**extent** колькасць старонак (*у кнізе*)
**extra** дадатковы
**extract** 1) цытата/вынятак (*з тэксту*); 2) выбіраць цытату

# F

**f. + c.** гл. *folded and collated*
**face** гарнітура
**facing page** супрацьлеглая старонка
**facing pages** старонкі разгорту
**facsimile** факсіміле
**fair trading/fair dealing** сумленны бізнэс
**family** гарнітура шрыфту
**fanfold** фальцаванне веерам
**faulty copy** дэфектны паасобнік
**feature** сенсацыйны артыкул
**fee** ганарар/узнагарода
**feedback** вывучэнне думкі спажыўца
**feeder** падавальны механізм
**felt side** правы бок
**festive publication** юбілейнае выданне
**f + g** гл. *folded and gathered*
**fibre/fiber** валакно
**fiction** мастацкая літаратура
**figure** 1) рысунак (*графічная выява*); 2) лічба
**file** 1) тэчка; 2) файл; 3) захоўваць дакументы ў вызначаным парадку; 4) уводзіць дадзеныя ў файл
**file copy** 1) копія дакумента; 2) архіўны паасобнік (*паасобнік выдадзенай кнігі, які захоўваецца ў бібліятэцы выдаўца*)
**filigrane/filigree** вадзяны знак/філігрань
**filler** друкарскі матэрыял для запаўнення пустотаў на палосе
**film** 1) фотаплёнка/фотастужка; 2) фотарэпрадукаванне арыгінал-макета
**film assembly** мантаж плёнак
**film make-up** шыхтаванне плёнак
**film rights** права на экранізацыю
**film setting** фотанабор
**filter** фільтр
**final demand** апошняе патрабаванне (*перад спагнаннем аплаты праз суд*)
**final draft** рукапіс, гатовы да набору
**final proof/final revise** падпісны карэктурны адбітак
**finance** 1) акцыянерны і пазыковы капітал; 2) фінансаваць
**financial year** фінансавы год
**finish** 1) скончаць; 2) шытаваць (*рабіць аправу, апраўляць*)
**finished goods** гатовая прадукцыя
**finishing** 1) брашуравальна-шытарская праца; 2) аздабленне
**firm** 1) фірма; 2) цвёрды; 3) нязменны
**firm order** цвёрдая замова
**firm publication** фірмовае выданне
**firmabinder** тэчка
**first cost/first price** выдавецкі сабекошт
